Бібліятэка БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ

# Сталінская ПРАЎДА

Орган Петрыкаўскага РК КП(б)Б

№ 7 | Пятніца, 20 жніўня | 1943 г.

**ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**

Сяляне! Хавайце сваё дабро ад гітлераўскіх разбойнікаў.

Ні грама хлеба акупантам!

Партызаны! Зрывайце злачынныя намеры гітлераўцаў, перашкаджайце ім забіраць ураджай. Біце фашысцкую зграю, руйнуйце варожыя тылы.

Усё, што вырашчана на беларускай зямлі, павінна належыць толькі беларускаму народу.

## ЗАГАД ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА

15 жніўня г.г. у рэзультаце ўпорных баёў 16 і 84 Гвардзейскія стралковыя дывізіі, 238 і 369 стралковыя дывізіі вызвалілі гор. КАРАЧЭЎ ад нямецкіх захопнікаў, паказаўшы пры гэтым узоры мужнасці і ўмелых баявых дзеянняў.

У азнаменаванне дасягнутых поспехаў 16 і 84 Гвардзейскім стралковым дывізіям, 238 і 369 стралковым дывізіям, вызваліўшым гор. КАРАЧЭЎ, прысвоіць найменаванне „КАРАЧЭЎСКІХ" і ў далейшым іх іменаваць:

16 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія.
84 Гвардзейская Карачэўская стралковая дывізія.
238 Карачэўская стралковая дывізія.
369 Карачэўская стралковая дывізія.

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Савецкага Саюза І. СТАЛІН.**

15 жніўня 1943 года.

## Ні грама хлеба нямецкім акупантам

Нямецкія акупанты з першых дзён свайго гаспадарання на Беларусі пачалі каводзіць так званы „новы парадак", парадак заняволення, грабяжу, здзекаў і смерці для беларускага народа. Але нямецкім захопнікам не ўдалося пакарыць беларускі народ. Праваліліся ўсе іх планы і разлікі падавіць узброенай сілай разгарнуўшыйся паўсямесна ў Беларусі народны партызанскі рух.

Барацьба становіцца ўсё больш жорсткай. Немцы зараз ідуць на новыя злачынствы. Яны хочуць канчаткова разарыць і аграбіць беларускі народ. Паспеўшы ўраджай гэтага года нямецкія бандыты хочуць забраць сабе, паставіць насельніцтва Беларусі пад пагрозу галоднай смерці. Крывавыжэрны Гітлер нашым хлебам думае карміць сваіх шалудзівых фрыцаў, якія паляць нашы вёскі, забіваюць нашых дзяцей. Нашым хлебам ён хоча працягваць зладзейскую вайну.

У сваім звароце да партызан і партызанак, да ўсяго беларускага народа нашы воіны-беларусы пакляліся, — „свята выканаем загад вялікага Сталіна, не пашкадуем ні крыві, ні жыцця свайго ў барацьбе за святую справу, за разгром фашысцкіх катаў".

Свята-ж будзем выконваць і мы. Ні аднаго грама хлеба нямецкім акупантам!

Сяляне і сялянкі! Убірайце свой ураджай, абмалочвайце і хавайце яго ад рабаўнікоў — нямецкіх акупантаў. Захоўвайце свой хлеб так, каб ніводзін фашысцкі сабака не пранюхаў дзе ён ляжыць. Не даць чужынцам ніводнага грама хлеба — такую задачу павінен паставіць кожны селянін, кожны двор, кожная вёска.

Партызаны і партызанкі! Зрывайце злачынныя намеры гітлераўцаў, перашкаджайце ім забіраць ураджай. Біце фашысцкую зграю, руйнуйце варожыя тылы.

Кулю ў лоб, сякерай па галаве, а не хлеба бандытам-немцам!

## З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК САВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

Днямі нашы войскі, размешчаныя паўночна-заходнее і паўднёва-усходнее горада Спас-Дземенск, перайшлі ў наступленне супроць нямецка-фашысцкіх войск і за пяць дзён напружаных баёў занялі звыш 160 населёных пунктаў, у тым ліку горад Спас-Дземенск.

На Бранскім напрамку нашы войскі працягвалі паспяхова развіваць наступленне і, прасунуўшыся ўперад, занялі гарады Дмітраўск-Орлоўскі, Карачэў, Жыздра і інш. На працягу 18 і 19 жніўня на гэтым-жа напрамку нашы войскі прасунуліся ўперад і занялі 60 населёных пунктаў, у тым ліку станцыі Бярозаўка (34 клм. паўночна-усходнее Бранска) і Мыленка (32 клм. усходнее Бранска).

На Харкаўскім напрамку нашы войскі, перамагаючы супраціўленне і контратакі праціўніка, працягвалі наступленне і занялі гарады Чугуеў, Змееў, населёныя пункты Чэркаскае-Лазавое, Бальшая Данілаўка (1,5 клм. паўночна-усходнее Харкава). З узяццем чыгуначных станцый Вадзяная і Казягі нашы войскі перарэзалі чыгуначную лінію Харкаў-Палтава.

На працягу 17 і 18 жніўня нашы войскі падбілі і знішчылі 203 нямецкіх танкі. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 224 самалёты праціўніка.

## За граніцай

На днях войскі нашых саюзнікаў пасля ўпорных баёў поўнасцю занялі востраў Сыцылія.

— У Венгрыі і Румыніі адбываюцца антыгерманскія дэманстрацыі з патрабаваннем спынення вайны.

# КОМСАМОЛ У АВАНГАРДЗЕ

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны комсамольцы Петрыкоўшчыны па заклiку тав. Сталіна ўзняліся на свяшчэнную барацьбу і пакрылі сябе неўвядаемай славай, сталі авангардам у змаганні з фашысцкімі нягоднікамі. Комсамольцы актывізуюць баявыя дзеянні атрадаў, наносяць ворагу адчувальныя ўдары. Іх гераічныя подвігі, бясстрашша, вера ў перамогу над крывавым ворагам служыць прыкладам для ўсіх партызан.

Характэрным з'яўляецца учынак комсамолкі Ліды Ч. Працуючы прыбіральшчыцай у гебітс-камісара, палкая патрыётка сваёй Радзімы глядзела з агідай на разжырэлага нямецкага ката, замучыўшага сотні братоў і сясцёр беларускага народа. Яна замініравала пакой, які праз некаторы час узарваўся разам з гебітс-камісарам.

Комсамольцы-дыверсанты наносяць моцныя ўдары па шляхах зносін ворага. Падрыўная група комсамольца Нікалая С. пусціла пад адкос 11 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай. Толькі пад абломкамі аднаго з саставаў знайшлі сабе магілу 270 гітлераўцаў. Комсамолец-падрыўнік Жорж Б. з сваёй падрыўной групай пусціў пад адкос 9 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. Комсамольцы-падрыўнікі Пятро Р., Лёня Д. і Валодзя Е.—удзельнікі пуска пад адкос 4 варожых эшалонаў.

Гераічна змагаліся комсамольцы ў час жорсткіх вясенніх баёў з карнымі часцямі нямецкіх войск. Толькі ў баі за вёску М. комсамолец Іван Л. знішчыў 22 немцаў.

Побач з актыўнымі баявымі дзеяннямі комсамольцы вядуць агітацыйна-масавую работу. Вылучаны і працуюць агітатары-комсамольцы, якія з'яўляюцца сапраўднымі насіцелямі ў масы сталінскага слова праўды. Яны праводзяць бяседы аб наступальных дзеяннях Чырвонай Арміі, разаблачаюць фашысцкую брахню.

Цяпер, калі Чырвоная Армія гоніць фашысцкіх сцярвятнікаў з роднай зямлі, комсамол павінен яшчэ больш актывізаваць сваю баявую дзейнасць. Кожны ўдар, нанесены ворагу з тылу, дапаможа нашым воінам наблізіць радасны дзень перамогі.

ПЯТРО С.—
сакратар райкома комсамола.

# Дзед Іван

Калі дзед Іван прышоў у партызанскі атрад, маладыя партызаны смяяліся:

—Не пад годы ўжо табе, дзеду, біць нямчуру. Не справішся з маладымі.

Нават камандаванне атрада і то рашыла дзеда накіраваць у гаспадарчую частку. Але дзед Іван запратэставаў:

—Вы мне дайце стрэльбу! Я настаяшча хачу пагутарыць з нямчурой!

Камандзір рашыў задаволіць просьбу, бо дзед, як відаць, прышоў не жартаваць. Так 73-гадовы дзед Іван стаў чырвоным партызанам. Каранастая дзедава фігура, яго суровы погляд яшчэ тоіць нямала ў сабе той нянавісці, якая кіруе дзейнасцю дзеда.

Дзед Іван пранікае незаметна ў варожыя гарнізоны, заўсёды прыносіць важныя звесткі. Нядаўна ён разам з сваёй падрыўной групай узарваў на чыгунцы 32 рэйкі. Па ініцыятыве дзеда Івана ўзарвана труба вадакачкі на станцыі К.

—Я адпомшчу паганцам,—кажа дзед Іван,—сурова адпомшчу за наш родны абрабаваны край.

МІХАСЬ Б.—
энскі партызанскі атрад.

# Баявы рахунак Алеся

Любоў да Радзімы і нянавісць да ворагаў—вось тыя пачуцці, якія кіруюць дзейнасцю Алеся Б., партызана атрада К.

Стойкі і бязлітасны ў баях з ворагамі, вынаходлівы ў дзеяннях на чыгунцы, Алесь не дарэмна карыстаецца вялікай пашанай сярод партызан. На яго баявым рахунку 11 пушчаных пад адкос эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага. Не адна сотня гітлераўскіх сабак знайшла сабе магілу пад абломкамі вагонаў, узарваўшыхся на мінах, майстэрскі паложаных Алесем. Алесь удзельнічаў у разгроме двух паліцэйскіх гарнізонаў і ў вясенніх баях за вёску Г. Разам з падрыўнікамі ён падарваў на чыгунцы 81 рэйку.

Акрамя гэтага, Алесь і разведчык. Ён разам з сваім таварышам Колей праходзяць у распалажэнне варожых гарнізонаў і прыносяць дакладныя звесткі аб сіле і намерах ворага.

ГАНКА С.

# У адказ на загад правадыра

Новымі ўдарамі па камунікацыях ворага адказалі падрыўнікі энскага атрада на загад таварыша Сталіна.

Натхнёныя гераізмам чырвоных воінаў, камандзіры падрыўных груп браты Андрэй і Павел накіраваліся на выкананне баявога задання. Завідна падпаўзлі яны да чыгункі, зрабілі дасканалую разведку і, разбіўшыся на 2 групы, пачалі самастойна дзейнічаць. На змярканні пачуліся ўзрывы — гэта падрыўныя групы двух братоў парушылі вячэрнюю жнівеньскую цішыню. 71 рэйка была ўзарвана.

—Ні праходу, ні праезду не дадзім фашысцкай погані,—заявілі браты-падрыўнікі.

МІХАІЛ М.—
камісар энскага атрада.

# Замест хлеба—кулю

Нямецкія бандыты прыехалі ў нашу вёску і пачалі касіць сялянскія пасевы. Аб гэтым мы паведамілі партызанам Мішы Б., Шлёме Р. і Івану З., якія ішлі на выкананне баявой задачы. Не гледзячы на перавагу ворага, народныя заступнікі рашылі не даць нямецкім бандытам тварыць іх зладзейскія справы. Доўга не разважаючы, адважная тройка напала на немцаў, двух знішчыла, аднаго ўзяла жывым. Астатнія бандыты кінуліся бегчы хто-куды.

Шчыра дзякавалі мы партызанам за адратаваныя пасевы.

ПІЛІП К., селянін вёскі С.

Рэдакцыйная калегія.

Выданне Петрыкаўскага РК КП(б)Б